Т. Ф. СУХОЦКАЯ

**КУРГАН ЯК СІМВАЛ СТАРАЖЫТНАЙ КУЛЬТУРЫ / PILIKALNIS KAIP SENOVĖS ISTORIJOS SIMBOLIS**

T. SUKHOTSKAYA

**MOUND IS SEEN AS A SYMBOL OF HISTORY AND CULTURE**

*The article reveals its semantic meaning in the example texts of fiction and displays the dynamics of the semantic content of the symbol.*

Курганы ёсць на ўсіх кантынентах, акрамя Аўстраліі. Найбольш вядомы археолагам скіфскія курганы ў Прычарнамор'і. Паяўленне курганоў на тэрыторыі Беларусі пазначаецца эпохай бронзы і ранняга жалеза. Наш народ гэтым унікальным помнікам гісторыі і культуры даў розныя найменні: валатоўкі, капцы, курганкі, шведскія магілы, французскія магілы, дзявочыя магілы, змяінкі, старыя кладкі [1, с. 269–270]. Сэнсавае напаўненне гэтых артэфактаў мянялася, удакладнялася ў розныя эпохі згодна з тымі падзеямі, якія пакідалі найбольш глыбокі, а часам і крывавы, след на беларускай зямлі. У народнай свядомасці курганам надаецца сакральны сэнс. З дадзеным топасам звязана шмат паданняў, легендаў, балад, ён стаў крыніцай не толькі народнай культуратворчасці, але і прафесійнай мастацкай інтэрпрэтацыі.

Курганы пачынаюць узнікаць недзе ў эпоху рассялення народаў, калі новыя пакаленні аказваліся далёка ад магіл продкаў і не маглі належным чынам даглядаць іх. Дзеля захавання месцаў пахавання і рабілі на магілах насыпы, таму асноўная функцыя кургана ўзводзіцца да забеспячэння цэласці і непашкоджанасці праху продкаў. Распаўсюджанай з'яўляецца думка, што курганы ў мінулым сімвалізавалі наяўнасць нейкай мяжы тэрыторый. На этапе шырокага распаўсюджвання курганнай культуры пахаванняў губляе значэнне іх сэнсавая сувязь з межамі. З ускладненнем і дыферэнцыяцыяй грамадства пачынае пераважаць ідэя ўвасаблення павагі да памерлага родзіча. Чым больш заслуг было ў чалавека, тым вышэйшы насыпалі курган. У наўгародскіх землях вялікім лічыўся курган дзесяці метраў, на іншых землях усходніх славян памеры былі разоў у дзесяць меншыя.

Славяне сваіх нябожчыкаў або хавалі ў зямлі, або спальвалі на вогнішчы, даручаючы богу Сварогу. Спальванне азначала, што дух памерлага чалавека на крылах Агнябога-Сямаргла адлятае ў Ірый (рай). Адгалоскам мінулых пахавальных вогнішчаў з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звычай запальваць каля мёртвага цела свечку, каб разам з полымем дух мог адыйсці да Агнябога, а душа – бачыць блізкіх, якія сабраліся каля цела.

Адным са спосабаў пахавання ў зямлі былі курганы, якія найчасцей мелі круглую або авальную форму – мацнейшы сімвал-абярэг. Месца для кurganоў выбіралі недалёка ад ракі, якая сімвалізавала раку Смародзіну, праз якую душа па Калінавым мосце пераходзіла ў іншы свет. Князёў хавалі вельмі пышна, разам з імі адыходзілі часам і іх родныя па добрай волі. Затым адбывалася трызна, гулянні, каб пакойнік апошні раз мог налюбавацца імі. Моцна гараваць па памерлым не дазвалялася, бо смерць успрымалася як заканамерны ход чалавечага жыцця.

Найбольш пашыраным вобраз кургана становіцца ў культуры рамантыкаў, якія звярнулі ўвагу на гісторыю і народную культуру. Адметнасць беларускага рамантызму ў тым, што ён не адвярнуўся ад рэальнага сацыяльнага быцця, а, наадварот, імкнуўся зрабіць яго карысным і справядлівым. Эстэтызацыя гераічнай мінуўшчыны ў беларускім рамантызме адыгрывала вялікую ролю дзеля фарміравання патрыятызму. Значны ўплыў на зварот да вобраза кургана аказвала і навукова-даследчыцкая дзейнасць па вывучэнні краю. Збор фальклорных запісаў, актывізацыя археалагічных раскопак уваскрашалі ў народнай свядомасці культурныя сэнсы і спрыялі абуджэнню годнасці беларуса.

Шмат у гэтым кантэксце было зроблена братамі Канстанцінам і Яўстахам Тышкевічамі, якія займаліся раскопкамі курганоў на Лагойшчыне. У 1842 г. яны стварылі першы на беларускіх землях гісторыка-археалагічны музей ва ўласным маёнтку, а ў 1856 г. адкрылі Віленскі музей старажытнасцей, пры якім працавала Віленская археалагічная камісія. Вынікі даследаванняў сотняў курганоў К. Тышкевіч абагуліў у фундаментальных працах «O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej» (Вільня, 1865), «Wiadomości historyczne o zamkach, horodyszczach i okopiskach starożytnych na Litewshiej» (Wilno, 1859). З 1868 па 1871 г. друкаваў справаздачы пра свае археалагічныя знаходкі ў газеце «Новое время», якая выдавалася ў Пецярбургу да 1872 г. Адамам Кіркорам.

К. Тышкевіч прапанаваў класіфікацыю курганных насыпаў: адзінкавыя, насыпаныя ў гонар правадыроў і старэйшын; згрупаваныя, з астанкамі воінаў; вартавыя, якія выконвалі функцыю дазору; дарожныя, што служылі арыенцірам для купцоў і воінаў; магільныя (могілкі мясцовага насельніцтва). Была распрацавана і методыка раскопак кургана. Апантанасць даследчыкаў узняла з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычнага забыцця ўнікальны артэфакт, іх намаганні былі скіраваны на ўвядзенне курганоў у шырокі культурны кантэкст. Як многія іншыя магнацкія кланы на беларускіх землях, такія як Радзівілы, Сапегі, Манюшкі, Агінскія, Храптовічы, таксама Тышкевічы стваралі «культурныя ідыліі» ў сваіх маёнтках, былі заўзятымі асветнікамі ў сваёй Айчыне. Іх эстафета была перанята наступнымі пакаленнямі ў XX ст.

Нацыянальна-дзяржаўнае адраджэнне паскорыла развіццё мастацкай творчасці, актывізавала працэсы сімвалізацыі (М. Багдановіч, Я. Купала, М. Гарэцкі, З. Бядуля, Я. Драздовіч і інш.). У беларускай культуры здольнасць сімвалізму ўзаемадзейнічаць з іншымі стылёвымі кірункамі выявілася праз перапляценне і кантамінацыю сімвалізму, імпрэсіянізму, экспрэсіянізму, мадэрнізму, рэалізму. Сацыяльная насычанасць сімвалізму паўплывала на праяўленне сімвалаў адраджэнскіх працэсаў. Гэта, найперш, музычныя інструменты: дудка, скрыпка, смык, гуслі і г.д. Але адным з самых багатых на семантыку з’яўляецца вобраз кургана.

Выява жанчыны-сфінкса на вокладцы зборніка «Курганная кветка» Канстанцыі Буйло, выкананая самабытным мастаком Я. Драздовічам, сімвалізуе загадкавасць і яшчэ не раскрытыя магчымасці таленту паэтэсы. «Курганная кветка» тоіць у назове сувязь з топасам кургана, месца, дзе сустракаюцца мінулае і сучаснае, мара і рэчаіснасць. Верш «Курган» выступае знакам трагічнага кахання паненкі Галіны і вясковага музыкі Янкі:

Там, дзе быстраю хвалею рэчка плыве,
У даліне між цёмнага лесу,
Прытаіўся высокі зялёны курган
Пад плакучых бярозак завесай…[2, с. 48–49].

Магчыма, захапленне курганамі братоў Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў, у якіх бацька паэтэсы працаваў пэўны час аб’ездчыкам, паўплывала на стварэнне К. Буйло рамантычна-трагічнага вобраза.

Адраджэнская культура Беларусі ў цэнтр грамадскага і культурнага жыццядзеяння паставіла сялянскае асяроддзе як крыніцу нацыянальнай самабытнасці. Гэтая адметнасць вылучае беларускую літаратуру між іншых, дзе носьбітамі духоўнасці выступаюць часцей інтэлігенты або абстрактны вобраз чалавека. Міфалагічныя матывы, найбольш уласцівыя народнаму светаўспрыманню, часта клаліся ў аснову мастацкага ўвасаблення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэі перамен у грамадстве, абуджэння ад летаргіі нацыянальнага жыцця. Прароцкай місіяй яны надзелены ў творчасці Янкі Купалы (да прыкладу, паэмы «Курган», «Сон на кургане»). «Удзірванелы курган векавечны» атаясамліваецца з людской памяццю, успрымаецца сімвалам унутранай сілы народа ў мінулым і стымулам яго сучаснага абуджэння. Курган становіцца алегорыяй не толькі духоўнага ўзвышэння, але і пераадолення лёсу. Аптымістычная скіраванасць твора прабіваецца праз узвышана-трагічнае гучанне.

У паэме-трагедыі «Сон на кургане» паэт звяртаецца да рэалій беларускай сітуацыі пачатку XX ст., імкнецца шукаць, знайсці прычыны адвечнага нацыянальнага «зла»: бяды, голаду, бяспраўя, несправядлівасці – і напружана шукае адказ на пытанне, як парушыць фатальную наканаванасць. Курган у творы атаясамліваецца са святым месцам, дзе адбываецца духоўнае ачышчэнне Сама. Сон Сама на кургане – гэта своеасаблівае вяртанне да сваіх каранёў, аднаўленне памяці роду, абуджэнне духоўных сіл. Курган сімвалізуе не толькі веліч мінулых часоў, але атаясамліваецца са «скурганелымі душамі», якія імкнуцца прарвацца з цемры, з жахлівых сутарэнняў на белы свет, да «новай зямлі».

Вобраз кургана быў папулярны і ў іншых славянскіх літаратурах, найперш рускай. Традыцыйнай семантыкай напоўнены ён у А. С. Пушкіна:

Ковши круговые, запенясь, шипят
На тризне плачевной Олега:
Князь Игорь и Ольга на холме сидят;
Дружина пирует у брега;
Бойцы поминают минувшие дни
И битвы, где вместе рубились они [3, с. 59].

У адной з ранніх балад А. К. Талстога «Курган» створаны рамантычны вобраз рускага асілка, пра якога захаваліся ў народзе толькі легенды. Паэт закранае праблему пошукаў сваіх каранёў і з сумам канстатуе наяўнасць гістарычнага і культурнага бяспамяцтва ў грамадстве. Культурная спадчына народа стала аб'ектам павышанай увагі рускіх інтэлектуалаў XIX ст. І заходнікі, і славянафілы настойліва шукалі ў глыбінях гісторыі славянства духоўны імпульс, здольны пераўтварыць сацыяльнае жыццё.

У культуры XX ст. топас кургана становіцца трагедыйным знакам культурнай прасторы. Курганы невыпадкова пачынаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узводзіцца як мемарыялы баявой славы, у гонар самаахвярных абаронцаў сваёй зямлі: у народнай культуры абсалютная каштоўнасць – бараніць Радзіму, не шкадаваць жывата свайго. Самымі вядомымі курганамі з'яўляюцца Мамаеў курган у Валгаградзе, Курган Славы ў Беларусі, Карэліі.

Гэты сціслы, у межах артыкула, агляд паказвае, што сімвалічная семантыка духоўнага складніка грамадства ў сучасных умовах заглыблена ў нацыянальную гісторыю, міфалогію, фальклор. XXI стагоддзе актуалізавала іх духоўную каштоўнасць.

---


*1.* Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*2. Буйло, Канстанцыя.* Курганная кветка / Канстанцыя Буйло // Вершы, драматычныя паэмы / Канстанцыя Буйло. – Факсім. выд. – Мінск : Мастац. літ., 1989. – 87 с.

*3. Пушкин, А. С.* У Лукоморья дуб зелёный… / А. С. Пушкин. – Ростов н/Д : Проф-Пресс, 2009. – 64 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ